Ба 239 427
239830

Францішк Алехновіч.

# КАЛІСЬ

## СЦЭНІЧНЫ АБРАЗОК у 2-х АКТАХ.

ВІЛЬНЯ — 1919.

239 427

Б. 92601/г ас 4007

Выдавецтва Менскага Камісарыяту Асьветы.

Ба 239427

Францішк Алехновіч.

1964 г.

# КАЛІСЬ

239427

## СЦЭНІЧНЫ АБРАЗОК у 2-х АКТАХ.

Бел. 2005

ВІЛЬНЯ — 1919.
ДРУКАРНЯ „ПРАМЕНЬ“

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

[illegible] 2010

## АСОБЫ.

**Юрка Івашка**, малады работнік.

**Людвіка**, маладая дзяўчына.

**Матка** яе, прачка.

**Суседка.**

**І-ы Незнаёмы.**

**ІІ-і Незнаёмы.**

**Хлапец.**

**Акалодачны.**

Работнікі, салдаты, паліцыя.

# АКТ I.

Па сярэдзіне дзвёры з шкляными шыбамі. Забодвух бакоў дзьвярэй вокны на вуліцу. У лёвай і правай кулісе па адных дзьвярах. З левага боку ля вакна даўгі стол да прасаваньня. Пры правым вакне канапа. З левага боку пры дзьвярах шафа з бялізнай, з правага, напроціў, невялічкі столік. Там і сям крэслы. Ваканіцы зачынены.

Рэч дзеецца ў 1905—6 гаду.

## ЗЬЯВА I.

Матка, Людвіка.

МАТКА — (сядзіць, п'е гарбату з сподачка). Не падабаецца мнé наш новы кватэрант.

ЛЮДВІКА — (прасуючы). Чаму, мама?

МАТКА. — Бо якійсь... без парадку. Варочаецца позна ў начы... Няма вéдама, дзе працуе...

ЛЮДВІКА.—Ен-жа казаў, што на хвабрыцы...

МАТКА.—Ды гдзе? на якой? мала-ж хвабрык? чорт яго вéдае, можа ён сацыаліст які, ці што?!

ЛЮДВІКА. — Дык што? Або сацыалісты ня людзі?

МАТКА. — Э, якія там яны людзі, пажалься Божа... Каб нам толькі бяды праз яго не набрацца!..

ЛЮДВІКА —Якое бяды?

МАТКА.—Пытаешся: якое? Ве́дама якое: прыдуць, арэштуюць і нас у турму пацягнуць за тое, што ў нас кватэраваў.

ЛЮДВІКА.—А яка-ж тут наша віна?

МАТКА.—Э, паліцыя не разьбірае! Цяпе́р такія часы!.. Ах, каб хутчэй усё гэта скончылася!..

ЛЮДВІКА.—Кончыцца, як скінуць цара...

МАТКА—(спужаўшыся). — Цс!.. Што ты?.. што ты?.. здурэла, ці што? Хто цябе́ навучыў казаць гэткія рэчы?.. Яшчэ хто пачуе!.. Хочаш сьцягнуць няшчасьце на сябе́ і на маю старую галаву!. Памятай, што і сьце́ны вушы маюць... Здурэла, далібог, здурэла...

(Чуваць стук у сярэднія дзьве́ры).

МАТКА — (спужаўшыся яшчэ больш). — Вось, маеш!.. А бе́дная-ж мая галованька!..

## ЗЬЯВА II.

Матка, Людвіка, Юрка.

ЛЮДВІКА — (адчыняе дзьвѐры. Уходзіць Юрка з якойсь пачкай). — А! пан Юры!

МАТКА. — Гэта вы? Фу, як напужалі!

ЮРКА (ўходзіць). — Выбачайце, што я пастукаў у гэтыя дзьве́ры, але пабачыў, што ў вас яшчэ сьвѐціцца.

МАТКА. — Брама хіба яшчэ не зачынена?

ЮРКА. — Не зачынена, але мне́ не хаце́лася спатыкацца з сторажам: ён сядзіць на варце...

МАТКА. — Вячэраць будзеце?

ЮРКА. — А буду, панечка, калі вы былі ласкавы пакінуць для мяне́.

МАТКА. — Пакінула, ве́дама, што пакінула (ідзе́ ў дзьве́ры на ле́ва).

ЮРКА. — Выбачайце, што нарабіў вам клопату...

## ЗЬЯВА III.

Людвіка, Юрка.

ЛЮДВІКА (аглядаючыся на дзьве́ры, праз катарыя выйшла маці). — Ну, што новага?

ЮРКА. — Усё ве́льмі добра... Заўтра пачынаюць баставаць усе́ нашыя гарбарні... Васьмігадзінны дзе́нь работы і павялічэньне платы!

ЛЮДВІКА (паказваючы на пачку). — Што гэта?

ЮРКА. — Нелегальшчына... Адозвы... (выцягавае з кішані не́калькі друкаваных аркушыкаў). Маеш трохі, хавай... Вось толькі сумная справа: трэба нам будзе на не́йкі час расстацца... Сягоньня яшчэ перапачую, а заўтра раніцай е́ду...

ЛЮДВІКА (сумна). — Чаму?

ЮРКА. — Паліцыя ўжо здае́цца панюхала, што я тутака... Апрача гэтага трэба наладзіць работу на правінцыі .. Пасылаюць... Правінцыя сьпіць... Няма арганізацыі.

ЛЮДВІКА. — Ц !.. Мама йдзе́! (варочаецца да свае́ работы).

## ЗЬЯВА IV.

Людвіка, Юрка, Матка.

МАТКА (уходзіць з талéркай і міскай). — Вось маеце, пан Ягор, сваю вячэру...

ЮРКА. — Дзякую, панечка...

МАТКА. — Што ж вы сягоньня так позненька? Работа на хвабрыцы мусіць даўно ўжо скончана?

ЮРКА. — Мéў інтарэсы... Заўтра éду, панечка.

МАТКА. — Едзеце? Як?.. Куды?... А як-жаж з кватэрай будзе?

ЮРКА. — Заплачу пані за цэлы мéсяц і можаце мой пакой аддаць каму іншаму.

МАТКА. — Ну добра... — А як-жаж хвабрыка, работа? кідаеце?

ЮРКА — Кідаю, пані. Еду на вёску. . да радні... Пісалі, просяць, каб прыéхаў пагасьціць.

МАТКА. — Вось гэта добра! Шчасьлівы вы, што маеце куды паéхаць! Часы цяпéр такія неспакойныя, — чалавéк ня вéдае, што заўтра будзе... Як вы, панок, думаеце, як усё гэта кончыцца?

ЮРКА. — Што-ж, добра скончыцца. Усё добра будзе, як рабочы народ завядзé новы лад.

МАТКА. — Э, які там „новы лад“! Нічога тут не парадзім! Там сіла, там войска, а тут што? — голыя рукі!..

ЮРКА (усьмяхаючыся). — Панечка! Гэтыя голыя рукі—так сама сіла, страшэнная сіла! Гэтыя голыя мазалістыя рукі будуюць і царскі палац, і турму для свайго брата. Гэтыя рукі сéюць хлéб

і будуюць чыгункі, каб развазіць яго. (З гэстам) Гэтым рукам, панечка, пазволена супачываць толькі адзін раз у тыдні, а што будзе, калі гэтыя рукі ня возьмуцца за работу праз увесь тыдзень, а мо' праз другі, праз трэці?!.. Што, калі мы іх зложым вось так на грудзёх (гэст) і скажам: давайце нам іншае жыцьцё, давайце, паны, волі, бо дыхаць ужо чым ня маем, давайце, бо вось так стаяць будзем, а да працы ня пойдзем! Падохнем з голаду, а і вы з намі разам падохнеце!..

МАТКА. — Гаварыць, то вы ўсе хораша гаворыце... Што-ж калі гэта ўсё толькі гутарка. Ніколі гэтага ня будзе!

ЮРКА (з перакананьнем). — Будзе, панечка!

МАТКА.—Ня будзе!... Адных пасодзяць у турму, іншых вышлюць, а іншых нават расстраляюць а рэшта—супакоіцца... Шмат сьлёз і крыві толькі дарма пральецца—вось, што вы зробіце! І на што каму патрэбны гэтыя ахвяры?!

ЮРКА. — Без ахвяр нічога ня зробіш, пані! Усялякая новая справа вымагае ахвяр. Без ахвяр не абыйшоўся ніякі пераварот... Але!.. але! многія з нас згінуць, многа крыві пральецца, многа ў турмах, або ў ссылцы загубяць сваё жыцьцё, —а ўсё-ж такі наш верх будзе! нашым сыном за тое лягчэй будзе жыць.

МАТКА. — Эх, ня веру! Гутарка, толькі гутарка!.. З матыкай на сонцо кідаецесь! і вось усё! Шкада мне вас, пане Ягор! У вас, бачу, так сама, як і ў іншых, у галаве перавернена! Такі малады, такі разумны вы чалавек; вы-бы маглі так добра

наладзіць сваё жыцьцё! . На мой стары розум, нічога з гэтага ня будзе. Шкада сіл, шкада ахвяр!

ЮРКА. — Не шкадуйце, пані! Жыць для ідэі і нават згінуць з вялікім клічам на вуснах — гэта так сама шчасьце! . Э, што тут гутарыць, (усьмяхаючыся) мы з вамі ніколі не згаворымся!..

МАТКА (сумна). — Шкада мнé гэтых матак, сыны каторых так марна што дзéнь гінуць!

ЮРКА. — І многа яшчэ згіне, пакуль сонцо волі заясьнée — а ўсё-ж наш вéрх будзе!

МАТКА. — Эт, вас не пераканаеш! (Зьмяніўшы тон): Дык вы запраўды, значыць, éдзеце?

ЮРКА. — Еду, пані! (дастаé грошы). Я вам за паўмéсяца заплаціў ужо, значыцца налéжыцца яшчэ за паўмéсяца? Так? Крыўды ніякае няма, панечка?

МАТКА (бярэ грошы) — Ды не, добра, усё добра... Як раз я пасьпéла прад выездам прыгатаваць вашу бялізну.

ЮРКА. А, гатова бялізна? Добра. Колькі налéжыцца?

МАТКА. — Людвіська! Падай пану Ягору яго бялізну!.. Рубéль сорак...

ЮРКА (бярэ бялізну, плаціць). — Вось грошы... Ну, а цяпéр, панечка, дзякую вам за ўсё, бо не абачымся — я вéльмі рана éду... Выбачайце, калі я зрабіў вам што кèпскага, і — не спамінайце благім словам... (цалуе яé ў руку).

МАТКА. — Пачакайце-ж, трэба вам яшчэ даць рэшты... (ідзé на лéва).

## ЗЬЯВА V.

Людвіка, Юрка.

ЮРКА (да Людвікі ціха). — Сягоньня я прыду да цябе пагутарыць...

ЛЮДВІКА. — Добра. Як маці засьне...

ЮРКА. — Алё. А трудненька-ж пераканаць тваю маму!..

ЛЮДВІКА.—Яе не пераканаеш. Шкада толькі, што пачаў гаварыць аб гэтым!

ЮРКА. — Усё роўна...

## ЗЬЯВА VI.

Людвіка, Юрка, Матка.

МАТКА (варочаецца). — Вось маеце, панок, 60 капеек...

ЮРКА.—Добра, дзякую... Ну і трэба мне ўжо забірацца ў сваю кануру, супачыць... Ну, яшчэ раз (цалуе Матку ў руку і падае руку Людв.) бывайце здаровы і блага не ўспамінайце! (забірае бялізну і пачку, каторую прынёс з вуліцы, і йдзе на лева).

## ЗЬЯВА VII.

Людвіка, Матка.

МАТКА. — Бывайце здаровы, няхай вас Бог сьцеражэ! (да Людв.): Ну, і нам ужо пара супачыць. Праз увесь дзень замарыліся! Кладзіся ўжо спаць, бо заўтра трэба рана ўставаць! (Забірае талерку Юркі).

ЛЮДВІКА (ідзе на лева).

## ЗЬЯВА VIII.

Матка, пасьля Людвіка.

МАТКА (адна). — Эх, моладасьць, моладасьць! Вецер у галаве і больш нічога! (іронічна). Хэ—хэ! Яны сьвет перавернуць уверх нагамі! Хэ, сьмех, дый толькі!

ЛЮДВІКА (уходзіць; нясе пасьцель і кладзе яе на канапе).

МАТКА. — Я вазьму лямпу (бярэ лямпу), а ты бяры сьвечку... Толькі, бач, ня чытай у начы сваіх дурных афішак, бо і вачэй шкада і сьвечкі шкада! (ідзе на лева).

## ЗЬЯВА IX.

Людвіка (адна).

ЛЮДВІКА (запаляе сьвечку і сьцелець пасьцель на канапе). — Добра, ужо добра... (Паўза).

## ЗЬЯВА X.

Людвіка і Юрка.

ЮРКА (уходзіць, затрымліваецца каля дзьвярэй).

ЛЮДВІКА (дае яму знак, каб стаяў ціха на мейсцы, а сама йдзе на лева і слухае ля дзьвярэй, ці маці ўжо лягла спаць. Пасьля дае знак, што «ўсё добра»).

ЮРКА (падыходзіць бліжэй).

ЛЮДВІКА. — Ну, кажы толкам: куды едзеш? на што? ці канечна патрэба?

ЮРКА. — Трэба, Людвісечка, трэба! Ахрана напала ўжо на мой сьлед. Калі-б мяне злавілі, кепска было-б для мяне і дрэнна для справы.

Трэба ўцякаць!.. Апрача таго, я тут ужо зусім непатрэбны: тут работа ўжо наладжана, ідзе добра, а вось у правінцыі патрэбны людзі... (абыймае яе). Ах, Людвісечка! каб ты ведала, як мне ня хочацца ехаць, раставацца з табой! Ды нічога не парадзіш, трэба ратавацца!..

ЛЮДВІКА. — Божанька ты мой! Мне страх, ці спаткаемся яшчэ калі ў жыцьці!..

ЮРКА. — О, Людвісечка! я-ж буду ад часу да часу прыяжджаць, пабачымся... (сядае на канапе). Ох, замарыўся я праз увесь дзень! (глядзіць уперад). Усё кіпіць, усюды йдзе работа, кожны дзень прыносіць з сабой новыя здарэньні... Здаецца, тутка стануць чыгункі.

ЛЮДВІКА (радасна). — Што ты кажаш?!

ЮРКА. — Але! Усё жыцьцё стрымаем! Усё станець!..

ЛЮДВІКА (як выж.). — А, Юрачка-ж ты мой!

ЮРКА. — Вось як то будзе, мая галубанька! І хутка ўжо трэба будзе выйсьці на вуліцу, каб паказаць сьвету нашую моц, нашую сілу!.. Цяпер арганізуюцца лятучыя баявыя дружыны і вось я еду арганізаваць гэтыя самыя дружыны на правінцыі.

ЛЮДВІКА. — Юрачка ты мой! каб цябе тольки там не спаймалі!

ЮРКА. — Хіба не... А што суджана, ад таго не ўцячэш! Няма што!.. (раптам) Людвіся, любіш ты мяне?

ЛЮДВІКА (сьмяецца). — Вось — пытаецца!

ЮРКА. — Вельмі? Моцна?

ЛЮДВІКА (жартуючы). — Не, ня люблю! (закідае яму рукі на шыю і сьмяцца) Ненавіджу!

ЮРКА (я. в.).—Ніколі не забудзеш?

ЛЮДВІКА. — На што пытаешся? — Ніколі!

ЮРКА (я. в.) — Прысягнеш?

ЛЮДВІКА. — Прысягаю!

ЮРКА.—Не, ня так! (выймае рэвальвэр). Прысягнем сабе́ ве́рнасьць на гэты браўнінг... (складаюць рукі на рэвальвэр). Прысягаю...

ЛЮДВІКА (паўтарае за ім). — Прысягаю. .

ЮРКА. — ... што буду цябе́ любіць ве́чна...

ЛЮДВІКА (я. в.) — ... што буду цябе́ любіць ве́чна..

ЮРКА. — ... аж да магілы...

ЛЮДВІКА. — аж да магілы...

ЮРКА. — Калі-ж бы зрадзіў цябе́...

ЛЮДВІКА (я. в.) — ...Калі-ж бы здрадзіла цябе. .

ЮРКА. — ...няхай за маю няве́рнасьць...

ЛЮДВІКА. (я. в.) — ...няхай за маю няве́рнасьць...

ЮРКА. — ...пе́ршая на вуліцы куля расчэпіць мне́ галаву...

ЛЮДВІКА (я. в). — ...пе́ршая на вуліцы куля расчэпіць мнѐ галаву.

(Юрка хавае рэвальвэр. Цалуюцца).

За вакном чуваць цяжкія крокі не́калькіх людзе́й і звяканьне аружжа.

ЮРКА (хутка задзьмухавае сьве́чку).—Патруль! (Паўза. Запаляе сьве́чку). Праз шчэліны ў вашых вакяніцах відаць усё, што дзе́ецца ў сярэдзіне.

ЛЮДВІКА. — Я закрыю (закрывае вакно колдрай).

ЮРКА (памагае ей). — Ну, вось гэтак, — гэтак будзе спакайне́й...

ЛЮДВІКА (сядае на канапе).

ЮРКА (сядае на падлозе і кладзе́ галаву на яе́ кале́ньне). — Ох, як мне добра, Людвіська! Добра!. А табе́?

ЛЮДВІКА. — І мне́ добра, Юрачка!

ЮРКА. — Каб так праз усё жыцьцё!

ЛЮДВІКА. — Ты хацеў-бы?

ЮРКА. — Але́!

ЛЮДВІКА. — Ад цябе́ гэта зале́жыць.

ЮРКА — Не, Людачка, гэта ня так! Хто ня ведае, дзе заўтра прачхне́цца, ці на сваім сяньніку — у хапе, ці на турэмных нарах, той ня можа... не павінен абзавадзіцца сям'ёй, бо.. і іншым папсуе́ жыцьцё і сябе́ адарве́ ад справы грамадзянскай .. Іншым ужо так на долю выпала — праз усё жыцьцё быць бясхатнімі... Прачытай вось тую кніжку, што я калісь табе́ даў, — зразуме́еш...

ЛЮДВІКА. — Юрка! А калі-б і я працавала з табой для справы грамадзянскай, калі б мы супольна працавалі, тады-б маглі быць заўсёды разам? Юрка! пазнаём мяне́ з кім трэба, дай працу!..

ЮРКА. — Я ўжо аб гэтым думаў... я казаў ужо аб табе́. Тут да цябе́ яны самі зьве́рнуцца... як

прыдзе час... Бач толькі, каб твая мама ні аб чым не давéдалася...

ЛЮДВІКА. — О крый Божа! Не даведаецца!

ЮРКА. — Бо зрабіла-б страшэнную аванту-ру!.. Вось пакуль што чытай. Прачытай усé кніжкі, якія я табé даў...

ЛЮДВІКА. — Добра... І тады будзем заўсёды разам. Я паéду туды, дзе ты будзеш, пашукаю для сябé якой работы. Добра, Юрачка?—будзем разам?

ЮРКА. — Будзем разам... пакуль турма не разлучыць...

ЛЮДВІКА. -- Ох, не кажы гэтак, бо мнé плакаць хочацца! (чуваць гдзесьці званок ад брамы).

ЮРКА (слухае).—Цсс!.. звоняць!

ЛЮДВІКА (спакойна). — Звоніць нéхта да сто-ража.

ЮРКА. — Звоняць!!. прачуваю нéшта благое. Хто вéдае! мо' гэта... (чуваць стук у дзьверы з вуліцы)

ЮРКА. — Прышлі!! Трэ' ўцякаць!

ЛЮДВІКА.—О Божа!.. Гдзе-ж ты схаваешся?!.

ЮРКА (гаворыць шыбка). — Тут — выжэй — у гэтым доме таварышы — схаваюць, каб толькі пасьпець, пакуль брама... — Палі ўсё што я табé даў! — Бывай здарова!.. (абыймае яé, цалуé і выбя-гае на права).

## ЗЬЯВА XI.

Людвіка, пасля Матка.

ЛЮДВІКА (бяжыць да шафы з бялізнай, выця-гавае з сподняй паліцы схаваныя там папéры і кідае

ў пе́ч; пасьля хапае сьве́чку і падпалявае. У дзьверы стукаюць усё мацне́й).

МАТКА (акрыўшыся хусткай, выходзіць з левых дзьвярэй) —Хто·ж гэта стукае? Ты яшчэ ня сьпіш? Чаму ж ня пытаешся, хто там? (ідзѐ да дзьвярэй).

ЛЮДВІКА (ціха). — Мама! не адчыняй!

МАТКА (глядзіць зьдзіваваўшыся). — Чаго ты! што гэта?!.

ЛЮДВІКА (ціха). Паліцыя!.. (Як ўсе́ папе́ркі кінула ў пе́ч, і заясьне́ў агонь, ідзе́ да дзьвярэй і адчыняе́).

## ЗЬЯВА XII.

Людвіка, Матка, Акалодачны, салдаты і паліцыя.

АКАЛОДАЧНЫ (уходзіць з салдатамі і паліцыяй). — Здесь жывёт Георгій Івашко? Где он?

МА КА (хоча адказаць).

ЛЮДВІКА (дае́ ёй знак, каб маўчала). — Ен сягоньня яшчэ не вярнуўся...

АКАЛОДАЧНЫ. —Мы должны зделать обыск.

МАТКА. — Божа мой! чаго я дачакалася!..

ЗАСЛОНА.

# АКТ II.

Сцэна тая-ж самая. Дзéнь. Вакяніцы адчынены. Праз вокны відаць вуліцу і праходжых.

## ЗЬЯВА I.

Матка і Сусéдка.

(сядзяць пры стале):

СУСЕДКА.—Іду я сягоньня, панечка, да ятак,— яткі зачынены! Ну, што-ж, думаю сабé, нічога ня зробіш, —як рэвалюцыя, дык рэвалюцыя! трэба абыйсьціся бяз мяса! Ідў я ўжо дамоў, ажно спатыкаю Валентовую, сусéдку. Тая кажа:,„пойдзем на мітынг“! Ды на які мітынг? адчапіся, кажу. А тая: „пойдзем, ды пойдзем!“ Ну, пайшла я. Уходзім. Саля вялікая, а народу так шчыльна, што няма дзе сярнічку уваткнуць. Стаю. Гляджу. Ажно тут адзін якійсь у чырвоным краваце, кудлаты такі, ускочыў на стол і як пачаў гаварыць, як пачаў гаварыць, так быццам аблакат якійсь. Толькі на момэнт дух перавядзе, і йзноў гаворыць — і йзноў гаворыць! А каб вы вéдалі, што ён казаў!? не павéрыце! (цішэй) Усё на цара, ды на цара. „Проч, кажа, цара і усё такое, няхай жыве, кажа, рэвалюцыя“!

МАТКА.—А паліцыя што-ж на гэта?

СУСЕДКА. Дык пачакайце-ж, панечка!.. Паліцыі нідзе няма ні духу, як п̣омялом вымела!.. Дык вось, як той кончыў, усé пачалі крычаць, пляскаць рукамі — авантура!.. Ажно тут ускочыў на той с̣амы стол жыдок якійсь, малы, чорнамазы... Той так сама, як пачаў, як пачаў па іхняму, па жыдоўскаму гэргатаць, дык я аж дзівавалася, скуль гэта ў яго гэтулькі бярэцца! Ажно нарэшце узьлез якійсь лахматы — з барадой, ні то мужык, ні то мястовы — і пачаў, ведаеца, по нашаму, па простаму гаварыць... „Ды што, кажа, паны, тое ды сёе; што, кажа, буржуазы гэткія, каб іх нéмач! проч, кажа, цара і тое ды сёе, — дык я аж заплакала.

МАТКА. — А што дабра з гэтага мусіць ня будзе, дык ня будзе. Сама скажэце, панечка, вось бялізны ляжыць куча, сухая ужо, качать, прасаваць трэба, а ніводная з дзяўчат ня прыйшла да работы!— пайшлі, мусіць на гэтыя свае мітынгі!... І родная дачушка і тая кудысьці, бачыце, паляцéла, — так сама мусіць на якійсь мітынг... А я тут сяджу адна, як малпа кіпці абцяўшы, і ня вéдаю, што рабіць.

СУСЕДКА. — То-ж вы ня вéдаеце, панечка: на чыгунцы забастоўка — ні адзін поезд ня йдзе, на почце забастоўка, ўсе хвабрыкі, крамы — усё зачынена! Людзі па вуліцы ходзяць, як у сьвята якое, нічога ня робяць...

МАТКА.—Божа мой! што з гэтага ўсяго будзе!

СУСЕДКА.—Мусіць добра будзе, калі ўсé так за адно ўзяліся.

МАТКА. — А мянé страх бярэ.

239427

Дзяржаўная
бібліотэка БССР
імя У. І. Леніна

## ЗЬЯВА II.

Матка, Суседка, Людвіка.

ЛЮДВІКА (уходзіць з вуліцы. Да суседки). — Дзень добры, пані!

СУСЕДКА. — Добры дзень! Што-ж чуваць?

ЛЮДВІКА. — Вы-ж пані былі на вуліцы — самі ведаеце, што чуваць...

СУСЕДКА. — Але... Але...

МАТКА. — Скажы мне, калі ласка, дзе ты бадзяешся? З дзяўчат ніводная сягодня ня прыйшла, а ты замест памагчы мне тут, няма ведама дзе цягаешся без патрэбы!

ЛЮДВІКА. — Есьць цяпер важнейшыя рэчы, чымсі прасаваць якуюсь там бялізну... (распрануўшыся, ідзе ў пакой на лева).

## ЗЬЯВА III.

Матка, Суседка, пасля Людвіка (за сцэнай).

МАТКА — (да суседки.) — Вось вам!.. Разумненькая! Перавярнуў, ведаеце, ёй зусім у галаве гэты, што кватэраваў у нас калісь—Юрка. Я думала, што гэтыя афішкі і брашуркі будуць, пакуль ён тут будзе, а яго вось, бач, няма, а яна далей цягае скульсь розныя паперкі і лётае па якіхсь сходах, мітынгах, а па начах усё чытае ды чытае!.. Эх, лепш мусіць было-б, каб зусім ня ўмела чытаць, чымсі так дзяньгубіць *) і марнаваць здароў'е! Вучыцелькай, ці іншай паненкай усё роўна ня будзе.

*) Марнаваць час.

СУСЕДКА. — Цяпе́р ўся моладзь такая, панечка! Часы іншыя прышлі!

МАТКА. — Эх, часы, часы!..

СУСЕДКА. — Так, дзіўные часы!.. Ну, бывайце ўжо здорова, панечка! — пагаварыла, пагутарыла і лягчэй на душы зрабілося — і пайду ўжо сабе. (кажэ да Людвікі за сцэну). Да пабачэньня, панна Людвіся!

ЛЮДВІКА (за сцэнай).—Бывайце здаровы, пані!

## ЗЬЯВА IV.

Матка, Хлапец, пасля Людвіка (за сцэнай).

МАТКА (разглядывая разложэнную бялізну).

ХЛАПЕЦ (уходзіць).—Таварышка Людвіка тут жыве?

МАТКА. — Чаго табе?

ХЛАПЕЦ — Да таварышкі Людвікі.

МАТКА—(з іроніяй).„Да таварышкі...“ „да таварышкі...“ — Бач, які таварыш знайшоўся! (клічэ). Людвіська!

ЛЮДВІКА (за сц.) — А што?

МАТКА. — Хадзі сюды! Тутака якісь „таварыш“ мае да цябе патрэбу.

## ЗЬЯВА V.

Матка, Людвіка, Хлапец.

ЛЮДВІКА (уходзіць). — Да мяне́?

ХЛАПЕЦ (да Людвікі). — Таварышка Людвіка! пісулька для вас (выходзіць).

## ЗЬЯВА VI.

Матка, Людвіка.

МАТКА. — Слухай, ці мая бяда калі-колечы скончыцца?

ЛЮДВІКА. — Якая бяда?

МАТКА. — А ну з табой бяда. Я-ж ня ве́даю ні мінуты, ні гадзіны, калі на нас можа зваліцца няшчасьце. Я бачу, што ты спуталася з гэтымі здурэўшымі, з гэтымі рэвалюцыянерамі, (іронічка) з „таварышамі“...

ЛЮДВІКА (стаіць). — Ды кіньце, мама!

МАТКА. — Не, ня кіну! Хто-ж я табе́, чужая, ці родная маці, каб мне́ не бале́ла сэрцо, бачучы, што, з табой робіцца. Што ты думаеш, што не́шта вялікае зробіш? Не тваім носам рабілі, і не зрабілі, а толькі марна згінулі.

ЛЮДВІКА. — Ды кіньце, мама!

МАТКА. — Што „кіньце“? Я ей кажу да розуму, хачу яе́ прасьцерагчы, а яна: „кіньце ды кіньце“... Так, так, добра! ня слухай мяне́, а слухай розных сваіх „таварышаў“, яны цябе́ на добрую дарогу вывядуць!.. Мо' нават бяз шлюбу пачнеш жыць з не́йкім з гэтых гарэтыкаў.

ЛЮДВІКА. — Чаго мама да мяне́ сягоньня прычапілася, далібог не разуме́ю?!

МАТКА. — „Прычапілася!“ „прычапілася!“ Гэта-ж як ты мне́ атказаваеш! Бачу, што цябе́ ўжо яны зусім перарабілі на свой капыл: маткі свае́ не паважаеш!. Людвіська! Ты ўжо ня дзіця! табе́ ўжо 18 гадоў! Ужо пара падумаць аб сабе́. Пара ўжо выйсь-

ці замуж за якога сталага чалавéка... Бо памятай што сапсаваць сабé славу вéльмі лёгка, і тады праз усё жыцьцё пакутаваць будзеш і мянé праклінаць, што я цябé не сьцерагла.

ЛЮДВІКА. — Не хачу я замуж!

МАТКА. — Бо дурная! (устаé). Эх, Людвіська, Людвіська! Кажу табé да розуму, хачу выратаваць цябé, раблю, што магу. — Ня слухаеш маé рады,— рабі, што хочаш, — сама ўсяму віной будзеш Э, хэ-хэ! дачакалася я пацéхі на старасьць!.. (выходзіць).

## ЗЬЯВА VII.

Людвіка (адна).

ЛЮДВІКА (сьціснуўшы плячмі). — Чаго далібог мама... не разумею (адчыняе пісульку. Зіркнуўшы ў яé, упéшылася). А!.. (чытае) „Прыехаў на пару дзён. Сягоньня пабачымся. Твой Юрка". (кажа): Юрка прыéхаў! Юрачка прыéхаў! (махінальна бяжыць да люстэрка і папраўляе валасы). „Сягоньня пабачымся"... значыць ён хіба сюды прыйдзе? Гм!.. Што тут зрабіць?! (кліча); Мама! Мама!

## ЗЬЯВА VIII.

Людвіка, Матка.

МАТКА (ўходзіць). — Чаго хочаш?

ЛЮДВІКА. – Мама!.. Мамачка! Я маю да мамы прозьбу: сягоньня тут да нас нéхта прыйдзе...

МАТКА (іроніч.). — Мусіць ніхто іншы, як якійсь „таварыш"?

ЛЮДВІКА. — Мама! Я мамы вéльмі прашу... Мама памятае? — тут у нас кватэраваў Юрка Івашка.

МАТКА. — Дык што? Яго-ж няма.

ЛЮДВІКА. — Мамачка! ён сягоньня прыйдзе. Ен прыéхаў. Ен пісаў.

МАТКА. — Каб нам бяды набрацца — яго-ж паліцыя шукае. Добра, што тады так счасьліва удалося з гэтай рэвізіяй, — не заўсёды так будзе... Чаго-ж ён?..

ЛЮДВІКА. — Ну, так сабé... у госьці... да знаёмых... Што-ж тут дзіўнага?

МАТКА. — Ага, вось яно што! Значыцца між вамі яшчэ ня кончылася, а ўжо думала... Эй, дзяўчына! усё ты робіш супроць мянé, усё не паводлуг маіх думак. Ну што Юрка? Ці-ж гэта муж? Праўда, ён нічога... сымпатычны, разумны, аж дзівота, што просты работнік ды такі вучоны, але што-ж, калі ў галаве перавéрнена з гэтай рэвалюцыяй!.. (сядае).

ЛЮДВІКА (ня глéдзячы на матку). — Мама ўсё: муж ды муж, замуж ды замуж! Ці-ж нельга так быць знаёмымі?

МАТКА. — Я даўно ўжо бачыла, што між вамі нéшта было, я-ж не сьляпая, дзякаваць Богу!.. Людвіська! кажы мнé шчыра, усю праўду: было між вамі што, ці не?

ЛЮДВІКА (я. в.). — Чаго мама хоча?

МАТКА. — Кажы: так, ці не?

ЛЮДВІКА. — На што мама мяне́ мучыць?

МАТКА. — Гэта ты мяне́ мучыш! Не шкадуеш маіх сівых валасоў! Адказавай: так, ці не?

ЛЮДВІКА. — Мама... бо-ж я люблю яго!.. (сядае і закрывае вочы рукамі).

МАТКА (сумна). — Здурэла мая дачка, здурэла — ашале́ла! Эх, і мае́ віны, тут шмат! Чаму ж я адразу, як пачала нѐшта дагадавацца, не прагнала яго, як сабаку, гэтага бязбожніка! сацыяліста праклятага!.. Вось, значыць, якія ўсе́ гэтыя вашыя „таварышы“! — толькі ласы на чэсць дзявочую, а пасьля — фю! і паляце́ў гдзе́сьці у сьве́т шырокі.

ЛЮДВІКА. (Блізка плачу). — Мама! Хочаце? прагане́це мяне́! я зара пайду ад вас і не вярнуся боле́й, толькі ня мучце мяне!.. І скуль гэта ў вас бярэцца гэтая злосць на мяне́, да ўсіх, да ўсяго сьве́ту?! Вы-бы толькі мучылі ды мучылі мяне́ сваймі гутаркамі, кажучы, што гэта для дабра майго робіце... Я даўжэй, далібог, ня вытрываю! Кіну вас і пайду, куды вочы панясуць!

МАТКА. — Але, туды табе́ і дарога! Я бачу, што табе́ даўно ўжо хочацца ісьці „куды вочы панясуць“, валацуга ты!!

ЛЮДВІКА (ўскаківае). — Я яшчэ не такая, але мо́жа буду такой з віны мамы. Бо ня вытрываю тут, далібог, ня вытрываю! мне́ душна тут! зразуме́йце: мне́ душна тут!!

(За сцэнай прыбліжаючыйся сьпе́ў многіх галасоў.)

Кроў нашу каты льюць ракамі,
Сьлязы народныя цякуць.

Расправу з часам зробім самі,
Ці-ж будзем ве́чна каркі гнуць? —
Ня будзем даўжэй каркі гнуць!

Гэй, дале́й! гэй дале́й! Чутно кліч:
Штандар наш пераве́рне троны!
Ен увесь у крыві,
Аб волі родзіць сны.
А яго колер ёсьць чырвоны,
Бо ён ў работніцкай крыві,
Бо ўвесь ён змочан у крыві!

Гэй, проч, тыраны, проч з дарогі!
Хай прападзе́ ваш стары лад!
На суд вас клічам, на суд строгі
За крыўды, што цярце́ў наш брат...

(Абе́дзьве крыху маўчаць і слухаюць).

ЛЮДВІКА (д. с.). — Чырвоны штандар!.. (хапае капялюш).

МАТКА. — Ты куды хочаш ісьці?

ЛЮДВІКА. — Там — на дэмонстрацыю! Там пяюць пе́сьню крыві і свабоды! Я там павінна быць!..

МАТКА (адбірае ад яе́ капялюш).—Ня пойдзеш!!

ЛЮДВІКА. — Пайду! Яны — гэныя, што там, бліжэйшыя мне́ за родную маці!.. Пусьціце!.. аддайце капялюш!

МАТКА. — Ах, ты выpaдак гэткі! А я кажу, што ня пойдзеш, ашале́ўшая ты дзяўчына!

ЛЮДВІКА. — Не даіцё!.. Добра! Пайду і так!.. (хватае з канапы хустку).

(Чуваць трэск выстрэлаў; пяяньне *Чырвонага штандару* зьліваецца з гоманам народу).

## ГОМАН НАРОДУ.

I. Уцякай! войска йдзé!

II. Хавайся ў браму! салдаты страляюць!..

III. Далоў самодзяржаўе! няхай жывé рэвалюцыя!

IV. Людцы добрыя! ратуйце!..

V. Людзі! не здратуйця! памажэце ўстаць!..

VI. Давай дарогу, калі сам ня йдзéш!.. і т. п. залежна ад помыслаў рэжысэра.

(Праз вокны відаць народ, заховываючыйся адпавéдна да вышей дадзеных слоў. Чуваць зык разьбіванага шкла).

МАТКА (злой іроніяй): — Вось маеш!.. Ідзі цяпер!.. — Што-ж ты стаіш?! завесь вакно! хутчэй! хутчэй!..

(Адна завéшавае хвіранку на адным вакне, другая — на другім).

МАТКА. — Зачыняй дзьвéрі! хутчэй!

(Абéдьзе бягуць да дзьвярэй. Раптам дзьвéры з імпэтам адчыняюцца і ўходзяць 2-х незнаёмых, нясучы якогась мужчыну, каторага кладуць на канапе. Твару яго ня відаць, бо адвéрнен ад публікі).

## ЗЬЯВА IX..

Матка, Людвіка, Ягор, І-ы Незнаёмы, ІІ-і Незнаёмы.

МАТКА. — Не нясéце! не нясéце! ня трэба! Што вы?! згубіць нас хочаце?

І-ы НЕЗНАЕМЫ. — Хочаце, каб яго коні казацкія здратавалі?

II-і НЕЗНАЕМЫ. — Чалаве́к памірае, а вы бяз ніякае літасьці!.. (выходзяць).

(Людвіка і яе́ Матка стаяць трохі часу, ня ве́даючы, што рабіць).

## ЗЬЯВА Х.

Матка, Людвіка, Юрка.

ЛЮДВІКА (пасьля паўзы). — Трэба-ж яго ратаваць... (падыходзіць да канапы) Таварыш! што вам? вы ранены?

ЮРКА (памалу адварачывае голову).

ЛЮДВІКА (з крыкам кідаючыся да яго): — Юрка!!!

ЮРКА (цяжка дыхае, яму трудна гаварыць; прытамне́е): — Дзе я?..

ЛЮДВІКА. — Ты тут — у нас!

ЮРКА. — У нас?.. я думаў, што... (глядзіць на Людвіку, выцягівае руку) Людвіся!.. Ты?

ЛЮДВІКА. — Я... гэта я, Юрка! Што табе? цябе́ ранілі?

ЮРКА — Дыхаць... цяжка... Здаецца... тут (паказавае на грудзі).

МАТКА (прыглядаецца з боку гэтай сцэне. З яе́ твару відаць, што ве́льмі нездаволена).

ЛЮДВІКА (разшпіляе камізэльку і кашулю Юркі): Ах, мама, мама! памажэце мне́, я ня ве́даю, што рабіць!

ЮРКА. — Ня трэба... нічога... пройдзе...

МАТКА (падыходзіць). — Цяпе́р няма як ні дохтара паклікаць, ні да аптэкі схадзіць... (паказаваючы на вуліцу). Чуеш, што там?

ЛЮДВІКА. — Аптэка блізка... я пабягу... Выйду праз браму...

МАТКА. — Бойся-ж Бога! якжа-ж ты цяпе́р пойдзеш!

ЛЮДВІКА. — Нічога... (выбягае на права).

## ЗЬЯВА XI.

Матка, Юрка.

МАТКА. — Людвіся! чакай!.. Людвіся! (д. с.) Пабе́гла! Ах, што гэтая дзяўчына робіць!.. (падыходзіць да Юркі). І на што было вам туды лезьці!? Ах, людзі, людзі! (выбірае з шафы палатняныя кавалкі і бярэ з стала жбанок з вадой). Самі сябе́ не шкадуюць! губяць сваё жыцьцё маладое!.. А Людвіська — паляце́ла! а там на вуліцы пе́кла! Ах, людзі, людзі!.. (варочаецца да Юркі.) Пачакайце, пры́мецe руку... вось так... (абмывае яму рану).

ЮРКА. — Хто гэта?.. Вы... пані?...

МАТКА. — Але... але... Ляжэце спакойна!

ЮРКА. — Скуль я... тутака?

МАТКА. — Прынесьлі вас на нашу бяду не́йкія з вуліцы... Вось як супакоіцца, трэба вас будзе ў бальніцу...

ЮРКА. — Ня трэба... ў бальніцу... арэштуюць...

(На вуліцы робіцца спакайне́й.)

МАТКА. — Ага!.. А што ж вы думаеце, што тут у нас ляжаць і хварэць будзеце? Не, панок, выбачайце, але гэтага ня будзе! І так праз вас ужо шмат непрые́мнасьці было!..

Ах, пан Ягор, пан Ягор! Шмат вы мнé благога зрабілі, шмат! і за што? На што вы Людвіську збаламуцілі? на што вы ей у галаве перавярнулі? Эх, пан Ягор! вось цяпéр кара Божая на вас за гэта!..

Ах, каб цяпéр раптам увайшла паліцыя! штобы я ім адказала? як выкруцілася? — ляжыць ранены і няма ніякога адказу! Прапалі-б мы зусім. Што мнé цяпéр з вамі рабіць? што рабіць?!

ЮРКА. — Я... супачыну... зараз... пайду...

МАТКА. — Пойдзеце, алé!.. Так толькі кажаце. Як-жа-ж пойдзеце, калі вы ні рукой, ні нагой крануць ня можаце? Эх, бяда з вамі дый толькі!..

А Людвіську выкіньце, панок, з галавы і не намаўляйце яé на гэтыя рэвалюцыі. Яна ўжо мнé прызналася, што вас ня любіла і ня любіць і што вы задурылі éй галаву сваймі гутаркамі...

Эх, праўда!.. што я тут яму кажу, калі ён няпрытомны! Тут дохтар патрэбны, а не маé словы!.. А што з гэтай Людвіськай?! каб, крый Божа, ня здарылася якое няш...сьце!..

ЮРЫ.—Дайце... піць...

МАТКА. — Шт..? піць хочаце? Пачакайце, зараз вам прынясу сьвéжай вады!.. (ідзé на лева).

## ЗЬЯВА XII.

Юрка (адзін).

ЮРКА. (цяжка падымаецца) — Ня трэба... ім... перашкаджаць?.. Хай сабè... жывуць... як ранéй... Няхай... дзé шапка... Ня буду перашкаджаць.. (хоча ісьці да дзьвярэй і валіцца каля парога).

## ЗЬЯВА XIII.

Юрка, Людвіка.

ЛЮДВІКА. (ўбягае) — Ідзé доктар, Юрка!.. Юр... Што гэта?! Юрка! (падбягае да яго і падымае яго галаву). Што з табой, кажы, Юрачка, Юрка!..(пабачыўшы праўду, крычыць). Ах! не жывé! памёр!. без мянé!.. Божа! што мне рабіць?! Забілі зьвяры, майго Юрачку!.. помста разбойнікам!

(Падымае з яго грудзéй змочаную ў крыві хустачку).

Вось мой штандар! ён увéсь у крыві! Помста за пралітую кроў!..

(У далі чуваць сьпéў: «Чырвоны Штандар»).

Цсс!,. Юрка! Чуеш? „Чырвоны штандар!“ Наш «Чырвоны штандар»! Пяюць! Ідуць... Помсту нясуць за работніцкую кроў!.. (пачынае рытмічна дэклямаваць ў тахт пеянага за сцэнай марша).

Гэй, далéй! гэй, далéй! чутно кліч:
Штандар наш перавéрне троны!
Ен увéсь у крыві,
Аб волі родзіць сны.
А яго колер ёсьць чырвоны,
Бо ён ў работніцкай крыві.
Бо ўвéсь ён замочан у крыві!

Юрка! гдзé твой браўнінг? (шукае у яго кішэнях і знаходзіць рэвальвэр у кішані курткі). Вось!.. (цалуе яго). Юрачка! Іду ужо!. Помста тыранам, Юрачка!.. Помста тыранам!.. (выбягае праз сярэдзіну).

(Калі яна адчыняе дзьвéры ад вуліцы, уходзіць Матка).

## ЗЬЯВА XIV.

Матка, Юрка.

МАТКА. — Людвіся! стой! чакай! што ты робіш?

(Хоча бе́гчы за ёй, але раптам за сцэнай чувацъ выстрал, часьля трэск стрэляніны).

МАТКА (з крыкам закрывае сабе́ вочы рукамі).— Ах, Людвіся!!!

ЗАСЛОНА.

КАНЕЦ.

239427

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

Чорны Бор пад Вільняй.

Чэрвень—Ліпень 1917 г.

0-10

Бел. 2005

B000000104?196

**Цана 75 капеек.**

*Склад у „Беларускага Выдавецкага Таварыства“: Вільня, Вастрабрамская, № 9.*

*Можна купляць у кнігарні „Бел. Выд. Т-ва“: Вільня, Завальная, № 7.*